7. Болбас, В. С. Природосообразность воспитания в народной педагогике белорусов / В. С. Болбас // Педагогика. – 2007. – № 3. – С. 79–83.

## *РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ НА МАТЭРЫЯЛЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ*

**БАРЫСЕНКА Н.А., ФЕДАРУК К.Ю.**

*УА МДПУ імя І.П. Шамякіна*

*г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

*nat-1971@tut.by*

У артыкуле характарызуюцца некаторыя аспекты развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту з выкарыстаннем твораў каляндарна-абрадавай паэзіі.

Ключавыя словы: развіццё маўлення, дзеці дашкольнага ўзросту, каляндарна-абрадавая паэзія.

У вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі прадугледжваецца авалоданне дзецьмі дашкольнага ўзросту навыкамі і ўменнямі па адукацыйнай галіне “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”, паколькі дашкольны ўзрост лічыцца самым спрыяльным перыядам для адпаведнага развіцця. Менавіта ў гэты час адбываецца фарміраванне вуснага маўлення і навыкаў маўленчых зносін. Адпаведна авалоданне роднай мовай з’яўляецца адным з найважнейшых набыткаў у дашкольным дзяцінстве. На сённяшні момант навучанне роднай мове ажыццяўляецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі – дзеці мала чуюць родную мову ў паўсядзённым жыцці, а таму маюць бедны слоўнікавы запас, іх маўленне знаходзіцца пад уплывам рускай мовы, сучасная гарадская сям’я не з’яўляецца носьбітам і захавальнікам беларускай мовы, культуры.

У артыкуле паспрабуем ахарактарызаваць магчымыя сродкі і спосабы развіцця беларускага маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту праз выкарыстанне твораў беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі.

Увагу навукоўцаў і метадыстаў даўно прыцягвае неабходнасць выхавання і развіцця дзяцей на роднай мове. Гэтае пытанне актыўна вывучалася К.Дз. Ушынскім, Л.І.Ціхеевай, Н.С. Старжынскай, Д.М. Дубінінай і іншымі даследчыкамі. Родная мова, на думку Я.Коласа, гэта – “першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет”.

Актуальнай усё яшчэ бачыцца неабходнасць выявіць магчымыя спосабы арганізацыі працэсу навучання і выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту на роднай мове. На сённяшні дзень існуюць аб’ектыўныя перадумовы для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту: планамерная работа на спецыяльна арганізаваных занятках, падтрымка маўленчых зносін дзяцей у бытавых зносінах і гульнях.

Развіццё маўлення дзіцяці, авалоданне багаццямі роднай мовы, літаратуры, мастацтва – асноўныя элементы фарміравання асобы, нацыянальнай самасвядомасці дашкольніка, далучэння яго да вытокаў нацыянальнай культуры. Таму асаблівую ўвагу ў рабоце з дзецьмі дашкольнага ўзросту неабходна надаваць развіццю іх беларускага маўлення, уменню выражаць свае думкі, пачуцці, эмоцыі на мове свайго народа.

Навучанне роднай мове ў Беларусі ажыццяўляецца ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя, дзе беларуская мова толькі пачынае займаць месца, якое належыць ёй па праву, беларускамоўны матэрыял выклікае цікавасць, з’яўляецца сродкам выхавання свядомай грамадзянскай асобы, пачынаючы з дашкольнага ўзросту.

Для большасці дашкольнікаў першай мовай, якую яны чуюць ад бацькоў, на якой вучацца размаўляць з маленства, з’яўляецца руская. І хаця дзеці даволі рана далучаюцца да беларускай мовы і многія разумеюць яе, сапраўднае беларускамоўнае асяроддзе ў іх адсутнічае.

У сувязі з гэтым узрастае роля дашкольнай установы, на якую ўскладваецца адказнасць не толькі за развіццё камунікатыўных навыкаў у дзіцяці, але і за фарміраванне сродкамі мовы нацыянальнай самасвядомасці, за перадачу літаратурнай спадчыны, культурных традыцый, назапашаных беларускім народам на працягу гісторыі свайго існавання.

Адной з крыніц развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту можа служыць каляндарна-абрадавая паэзія.

Каляндарна-абрадавая паэзія, або паэзія земляробчага календара, – від фальклору, які суправаджаў аграрныя святы і працу земляроба на працягу гаспадарчага года. Беларуская каляндарна-абрадавая творчасць склалася ў XIV – XVI стст. Паэзія беларускага земляробчага календара ўключае звыш 20 жанравых і групавых песенных разнавіднасцяў. Яна прадстаўлена чатырма вялікімі цыкламі: веснавы, летні, восеньскі і зімовы. Кожная пара года ў сялянскім календары мела адпаведныя ім абрады, звычаі, павер’і, песеннае суправаджэнне. Агульнае ў іх – шырокая аграрная аснова, мэтавая ўстаноўка, асобныя матывы, што вынікалі з яе.

Найбольш поўна адбываецца далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да беларускай нацыянальнай культуры праз выкарыстанне цыклу каляндарна-абрадавых фальклорных святаў (“Дажынкі”, “Каляда”, ”Масленіца”, “Гуканне вясны” і інш.), якія суправаджаюцца адпаведным паэтычным матэрыялам. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення святаў значна пашыраецца слоўнік дзяцей, яны знаёмяцца з новымі паняццямі, прыказкамі, прымаўкамі, заклічкамі, прыгаворамі.

Падчас педагагічнай практыкі на базе дзяржаўнай установы адукацыі «Спецыяльны дзіцячы сад № 30 г. Мазыра» мы праводзілі мэтанакіраваную работу па развіцці беларускага маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з выкарыстаннем твораў каляндарна-абрадавай паэзіі. Першапачаткова была арганізавана гутарка аб каляндарна-абрадавых святах, былі прадстаўлены агульныя звесткі. Потым дзецям дэманстраваліся ілюстрацыі да адпаведнага свята, арганізоўвалася работа па развіцці звязнага

маўлення з выкарыстаннем методыкі «Складзі апавяданне па карціне». Мэтай працы з’яўлялася фарміраванне ўмення адказваць на пытанні і самастойна будаваць звязнае выказванне па карціне. Потым выкарыстоўвалі методыку “Перакладзі словы”, падчас якой прапаноўвалі дзецям перакласці пяць слоў з рускай мовы на беларускую.

Чыталі адпаведную літаратуру, вывучалі заклічкі, песенкі, пацешкі. Напрыклад, пры падрыхтоўцы да свята “Дажынкі” выкарыстоўваліся песенкі і пацешкі “Пойдзем, дзевачкі, ва лугі-лужочкі”; “Восень чырвоная, прыйдзі з радасцю”; “Коціцца-валіцца” і г.д.

Да свята “Каляда” выкарыстоўваліся песенкі, пацешкі, вершы “Дзе каза ходзіць”; “Добры вечар, гаспадару”; “Пастушкі гулялі, Каляду ігралі” і г.д

Да свята “Гуканне вясны” выкарыстоўваліся творы “Жавароначкі, прыляціце”; “Памажы, маці, нам вясну гукаці”; “Гушкі, гушкі, гушкі” і г.д.

Для актывізацыі маўлення дзеці вучылі на памяць заклічкі, пацешкі, якія адносяцца да адпаведнага свята.

Пры гутарцы пры падрыхтоўцы да арганізацыі свята “Гуканне вясны” мы вучылі заклічку “Жавароначкі, прыляціце” і для таго, каб дзецям было лягчэй запомніць яе,  выкарыстоўвалі прыём паўтарэння і тлумачэння незнаёмых слоў. Потым прапанавалі дзецям дыдактычную гульню “Каляндарна-абрадавыя святы”. Мэта гульні прадугледжвала выхаванне ўвагі, развіццё памяці, маўлення; актывізацыю слоўнікавага запасу. У ходзе гульні дзецям  патрэбна было суаднесці адпаведныя прадметы з малюнкам элементаў каляндарна-абрадавага свята.

Такім чынам, арганізацыя сістэматычнай працы па назапашванні лексічнага матэрыялу з выкарыстаннем каляндарна-абрадавай паэзіі дае магчымасць не толькі колькасна ўзбагаціць лексічны запас дзяцей дашкольнага ўзросту, але і развіць беларускамоўныя маўленчыя здольнасці з выкарыстаннем кампанентаў традыцыйнай нацыянальнай культуры.